## Да нармальнае працы

„Прыпарыла, нахмарыла і — ўдарыла...“[1] — такімі славамі наш без пары памершы паэт характарызуе надыход у прыпар навальніцы, якая такжа хутка мінае, як і прыходзе.

Вось гэты абраз Алеся Гаруна дужа падобны да апошніх падзеяў у Польшчы. І тут у затхлай атмасфэры раскладу і маральнае гнілі нейкай віхурай мільганулі крывавыя дні на вуліцах Варшавы, было многа грукату і шуму, многа вострых і рашучых слоў, а ў выніку ўсяго — жыцьцё вярнулася ў сваю старую каляіну...

Так прынамся сталася на „вярхох“ сацыяльнае будоўлі Польшчы. Пануючыя клясы захавалі ў непарушным стане свае старыя пазыцыі. Апрача зьмены прэзыдэнта і ўраду — уся адміністрацыя, блізу ўсе ваяводы, усе старосты і іншыя ўрадоўцы, у рукі якіх аддадзена жыцьцё, воля і дабрабыт „нізоў“ насяленьня, астаюцца на сваіх становішчах. І стары падзел дзяржаўных цяжараў не зьмяніўся, і спосабы спагону падаткаў... Усё — як і раней было...

Крыху інакш адбіліся маёвыя падзеі на „нізох“ сацыяльнае драбіны ў Польшчы. Сяляне і работнікі тут яшчэ маласьвядомыя, слаба з’арганізаваныя. У іх яшчэ не пасьпела разьвіцца вера ў сябе — у сваю ўласную сілу. Яны — паводле старое традыцыі — склонны былі ждаць для сябе вызваленьня ад магутнае волі і геройскіх дзеяньняў адзінак, якія захацелі б ім дапамагчы....

Такія настроі панавалі і сярод беларускае масы. І затым–та ў першы мамэнт аружнага выступленьня п. Пілсудзкага раптам прыпомніліся ўсе ягоныя старыя нязьдзейсьненыя абяцанкі і пасулы. Можа, цяпер яны зьдзейсьняцца?!.

*Ня зьдзейсьніліся і цяпер*. Ня зьдзейсьніліся, бо і не маглі зьдзейсьніцца: так ужо наладжана жыцьцё народаў, што *даюць* толькі тым, хто *мае сілу сам узяць,* а ў слабых адбіраюць і тое, што яны маюць ды ня могуць самі ўтрымаць...

Так счэзла „ачараваньне“ імем Пілсудзкага ў усіх тых, хто йшчэ *хацеў* верыць у гэтае імя. Счэзла — і ўжо ня вернецца.

Затое мы вярнуліся да старых, „нармальных“ у буржуазнай дзяржаве варункаў жыцьця, вярнуліся да тае сацыяльнае, палітычнае і нацыянальнае „раўнавагі“, на якой пабудавана сучасная Польшча. І ніводнае з нашых заданьняў — ці то сацыяльна–палітычных, ці культурна–нацыянальных, ці эканамічна–гаспадарчых ані не зьмянілася: наадварот, яны ўсе зь яшчэ вялікшай сілай трэбуюць свайго зьдзейсьненьня, але ўжо не прыпадковымі „героямі“, а *самымі працоўнымі масамі* — сялянамі і работнікамі.

Дык і шляхі, на якіх можна зьдзейсьніць гэтыя нашыя заданьні і здаволіць нашыя патрэбы, астаюцца ўсё тыя ж: гэта — перадусім *арганізацыя нашых сіл.*

Навучаныя гістарычнымі прыкладамі, і ўласнай практыкай, і — урэшце — прост лягічным разважаньнем, больш сьвядомыя беларускія сялянскія і работніцкія элемэнты ўжо даўно ўзыйшлі на гэты шлях. А сваю арганізацыю яны абаперлі на ідэі *аб’яднаньня працоўных вёскі і места,* якія толькі йдучы разам могуць спадзявацца перамогі ў змаганьні за ідэалы і сялян, і работнікаў. З гэтай мэтай у Заходняй Беларусі ўтварылася палітычная партыя — *Беларуская Сялянска–Работніцкая Грамада,* якая і зьяўляецца тым цэнтрам, дзе зыходзяцца абедзьве вялізарныя арміі працоўных.

Партыя гэтая — *легальная,* і кожны беларускі селянін, кожын работнік *мае права і павінен да яе належаць.* „Ідучы да сваіх мэтаў, — гаворыцца ў праграме партыі, — Беларуская Сялянска–Работніцкая Грамада карыстаецца шляхам легальнай, законнай барацьбы на аснове канстытуцыі і права“.

На гэтым шляху партыя ў жыцьці Заходняе Беларусі мае перад сабою шырокія магчымасьці і іх будзе выкарыстываць у поўнай меры. Трэба толькі, каб працоўныя нашых мест і вёсак падалі сабе ўзаемна руку на грунце *супольнае арганізацыі,* трэба, каб ніводная вёска, ніводнае мястэчка не асталіся па–за межамі арганізацыі, — і сялянска–работніцкая партыя, магутная, як сам наш працоўны народ, *вывядзе беларускія масы на шлях перамогі.*